

1



2

*Да арт. **Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў**: 1 — капэла беларускіх народных духавых інструментаў «Гуды»; 2 — ансамбль акардэаністаў «Туці».*

і аўдыторый. Сувязь паміж паверхамі ажыццяўляецца праз парадную 3-маршавую лесвіцу ў цэнтр. частцы і па 2 маршавых лесвіцах у бакавых крылах. Другі корпус пабудаваны ў 1969 з цэглы і зборнага жалезабетону. Шасціпавярховы прамавугольны ў плане будынак з прыбудаванымі да яго паўд. тарца 4-павярховым прамавугольным у плане аб'ёмам з актавай і спарт. заламі. Пластыку аб'ёму гал. фасада ствараюць жалезабетонныя рэбры на ўсю вышыню. Сцены атынкаваны пад граніт з украпінамі слюды. Міжкалонныя прасценкі маюць зубчастую паверхню. Трэці корпус узведзены ў 1972. Пяціпавярховы прамавугольны ў плане будынак на цокалі. Вынесены за межы плана 2-і паверх пазбаўляе гал. фасад манатоннасці. Другі комплекс ун-та на перасячэнні вуліц Гікалы і Платонава пабудаваны ў 1980 з цэглы і зборнага жалезабетону (архіт. П.Бяляеў, М.Волкаў). Яго складаную па канфігурацыі плана аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю ўтвараюць вучэбна-лабараторны корпус № 4 і корпус № 5 з вылічальным цэнтрам. Корпус № 4 — 5-павярховы прамавугольны ў плане будынак з вынесенымі наперад з боку гал. фасада аўдыторыямі. Пластыку гал. фасада ўзбагачаюць спараныя жалезабетонныя рэбры на выш. 3—5-га паверхаў. Гал. ўваход афармлены буйнымі пілонамі на ўсю вышыню будынка. Вертыкальнай дамінантай комплексу з'яўляецца 9-павярховы складаны канфігурацыі плана корпус № 5. Архітэктуры ўсіх карпусоў ун-та ўласцівы манументальнасць і параднасць кампазіцыі.

**БЕЛАРУ́СКІ ДЗЯРЖА́ЎНЫ УНІВЕРСІТЭ́Т КУЛЬТУ́РЫ І МАСТА́ЦТВАЎ** Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Засн. ў 1975 як Мінскі ін-т культуры на базе аддзяленняў Мінскага пед. ін-та і Бел. тэатр.-маст. ін-та. З вер. 1993 Бел. ун-т культуры, з 2001 — Бел. дзярж. ун-т культуры, з 2004 сучасная назва. Ун-т з'яўляецца вядучай ВНУ у нац. сістэме адукацыі ў сферы культуры і мастацтва. У снеж. 2007 ун-т рэарганізаваны шляхам далучэння да яго ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры», на базе апошняга і ф-та павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў ун-та створаны Ін-т павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў (ІПКПК) як структурнае падраздзяленне ун-та. У 2009/10 навуч. годзе 5 ф-таў: культуралогіі і сацыякульт. дзейнасці, традыц. бел. культуры і сучаснага мастацтва, муз. мастацтва, інфармацыйна-дакументных камунікацый, завочнага навучання (філіял у г. Мазыр); 26 кафедр; н.-д. лабараторыі «Традыцыйныя рамёствы беларусаў», «Беларускія народныя музычныя інструменты», «Беларускі народны сцэнічны касцюм», сац.-пед. і псіхал. служба, навук.-творчае аб'яднанне «Studia Humanitatis», літ.-паэт. аб'яднанне «БУКет», студэнцка-пед. аб'яднанне «Настаўнік»; прадзюсерскі цэнтр «Арт-мажор». Аспірантура (з 1989). Працуюць 4 саветы па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. З 1997 ва ун-це праводзяцца штогадовыя міжнар. навук. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя дням слав. пісьменства і культуры. У складзе ун-та маст. галерэя «Універсітэт культуры» ў Палацы Рэспублікі. Дзейнічаюць фалькл.-этнаграф. калектывы «Валачобнікі», «Грамніцы», «Баламуты»; хары — нар. «Талака», акадэмічны «Мара», мужчынскі «Віват», камерны «Дабравест»; ансамблі акардэаністаў «Туці», вак. «Universum»; маладзёжныя аркестры — канцэртны духавых і ўдарных інструментаў «Светач», эстр.-сімф.; капэла бел. нар. духавых інструментаў «Гуды»; майстэрня эстр. танца, ансамбль кафедры харэаграфіі; тэатр гульні «Белая Русь», тэатр-студыя «7-ы паверх»; струнны квартэт «Arco», вак.-інструм. ансамбль «Блі-



*Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў.*

кі», майстэрня нар. дэкар.-прыкладнога мастацтва. З кастр. 2002 выдае навук.-метадычны час. «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў». З сак. 2005 выходзіць студэнцкая газ. «Alma Paрега», працуе студэнцкае радыё.

Будынак узведзены ў 1975 (архіт. Л.Маскалевіч, Ю.Грыгор'еў, А.Беразоўскі, Г.Ласкавая, В.Капылоў). Прамавугольны ў плане гал. аб'ём будынка адлюстроўвае функцыянальны прынцып архітэктуры неарацыяналізму. Фасады разбіваюцца раўнамернай сеткай вокнаў, якія знаходзяцца ў паглыбленнях бетонных блокаў. Такія ж квадратныя блокі запаўняюць тарцовыя часткі будынка. Два прыбудаваныя высокія прамавугольныя ў плане аб'ёмы, якія атрымалі службова-тэхн. прызначэнне, маюць рабрыстыя абрысы сцяны, што надае стройнасць і ўраўнаважанасць кампазіцыі. Ячэістая структура фасадаў, утвораная блочнай бетоннай канструкцыяй, ілюзорна стварае мазаічны дэкар. эфект.

*Л.І.Доўнар, Ю.Ю.Захарына* (архітэктура).

**БЕЛАРУ́СКІ ДЗЯРЖА́ЎНЫ УНІВЕРСІТЭ́Т ТРА́НСПАРТУ.** Засн. ў 1953 у г. Гомель як Бел. ін-т інжынераў чыг. транспарту, з 1993 сучасная назва. У 2009/10 навуч. годзе 10 ф-таў: безадрыўнага навучання, ваен.-транспартны, гуманітарна-эканам., замежных студэнтаў, механічны, прам. і грамадзянскае будаўніцтва, прафес. арыентацыі і падрыхтоўкі да ВНУ, буд., кіравання працэсамі перавозак, электратэхнічны. Аспірантура з 1954, дактарантура з 1995. У структуры ун-та (2009) Ін-т павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў і спецыялістаў транспартнага комплексу, НДІ чыг. транспарту, навук. цэнтр комплексных транспартных праблем, аддзел сертыфікацыі, Н.-д. цэнтр экалагічнай бяспекі і энергазберажэння на транспарце, н.-д. сектар, 9 н.-д. лабараторый. Пры ун-це дзейнічае студэнцкі клуб імя засл. дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь А.Коваля, пры якім існуюць: нар. ансамбль танца «Палескія зоры», студыі танца — эстр. «КантрДанс», бальна-спарт. «Дансер», усх. «Урум», спарт. «MAXIMUM», харавая студыя, гурток чытальнікаў,

*Да арт. **Беларускі дзяржаўны універсітэт транспарту**: 1 — народны ансамбль танца «Палескія зоры»; 2 — удзельнікі турніру «За цудоўных дам».*



*1*



*2*